Падтрымай "Вясну" на PATREON

Затрыманых каля Дома правасуддзя павязуць на Акрэсціна

24.08.2018 **Тэгі**: адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Затрыманні каля Дома Правасуддзя. Фота: ПЦ "Вясна"

Пасля абвяшчэння прысуда па справе лідэраў прафсаюза РЭП Генадзя Фядыніча і Ігара Комліка каля будынку Дома правасуддзя, дзе праходзіў працэс, грамадскія актывісты зладзілі пікет у падтрымку незалежнага прафсаюза. Яны разгарнулі бел-чырвона-белыя сцягі, сцяг прафсаюза РЭП і "Еўрапейскай Беларусі".

Прыкладна праз 10 хвілін да іх пад'ехаў чырвоны аўтобус з амапаўцамі, якія затрымалі актыўных пікетоўцаў. Сярод затрыманых былі Вольга Нікалайчык, Леанід Кулакоў, Мая Наумава, Уладзімір Неўмяржыцкі, актывіст прафсаюза РЭП з Берасця Павел Мрочка, актывіст РЭП з Бабруйска Аляксандр Чмыхаў.

Пазней, пры адыходзе ад будынку суда былі затрыманы палітык Мікола Статкевіч, актывіст "Еўрапейска Беларусі" Максім Вінярскі і яшчэ некалькі чалавек.

Па дадзеных ПЦ "Вясна", 24 жніўня пасля суда па "справе прафсаюзаў" было затрымана 11 чалавек:

1. **Алесь Абрамовіч** (Барысаў)**;**
2. **Вольга Нікалайчык**;
3. **Леанід Кулакоў**;
4. **Мая Наумава**;
5. **Уладзімір Неўмяржыцкі;**
6. **Павел Мрочка** (Брэст)**;**
7. **Аляксандр Чмыхаў** (Бабруйск)**;**
8. **Максім Вінярскі;**
9. **Мікола Статкевіч;**
10. **Тамара Зайцава** (Калінкавічы);
11. **Андрэй Хрэнкоў.**


Усе яны былі дастаўлены **ў РУУС Маскоўскага раёна Мінска.**

Затрыманыя актывісты знаходзяцца ў РУУС ужо больш за тры гадзіны. Як стала вядома праваабаронцам “Вясны”, у мужчын адабралі шнуркі. Адзін з міліцыянтаў Маскоўскага РУУС паведаміў, што усіх затрыманых “афармляюць на суткі” і чакаць іх сёння не мае сэнсу. Верагодна ў панядзелак адбудзецца суд.

Твитнуть







Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН


Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

WWW.GAZETABY.CO

ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА




Палітзняволеную Вікторыю Кульшу ў зарэчанскай калоніі збіваў і душыў наглядчык

"У мяне ў першы ж дзень на ЦІПе здарыўся прыступ асфіксіі", — былая арыштантка Акрэсціна

"Мы прыдумлялі розныя махінацыі, каб папросту выжыць", — экс-зняволены пра жыццё і працу ў шклоўскай калоніі

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў



ГАЛОЎНАЕ







АПОШНІЯ НАВІНЫ

Патрабуем правясці расследаванне па факце смерці Мікалая Клімовіча і адсутнасці належнай медычнай дапамогі ў калоніях

Бацьку і дачку пакаралі "хатняй хіміяй" за ўдзел у акцыі пратэсту ў 2020 годзе

Палітзняволенаму Яну Папковічу прысудзілі 4 гады калоніі

Сяржук Сыс – Валянціну Стэфановічу: "Ганаруся табой, тваёй воляй і характарам"

Праваабаронца і валанцёрка "Вясны" Марыя Тарасенка: "Я маю ўнікальную магчымасць падтрымліваць людзей"


"Яго місія ў большым. Яго мэта — нешта дасягнуць і даказаць": вязні шклоўскай калоніі пра Вітольда Ашурка

Герб на акне, Курапаты і дзесяцігадовы малюнак. Тры справы супраць Беларусі, зарэгістраваныя ў КПЧ ААН

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Сітуацыя з правамі чалавека ў Беларусі. Красавік 2023







ПАРТНЁРСТВА

СЯБРОЎСТВА

























E-mail: viasna@spring96.org | Пры выкарыстанні матэрыялаў сайта актыўная спасылка абавязковая | RSS

CC BY